"Закончы прыказку"

1. Ваўкоў баяцца ...(у лес не хадзіць).

2. У чужым воку саломку бачым... (а у сваім бервяна не заўважаем).

3. Хто апарыцца на малацэ ...(той і на ваду дзмухае).

4. Бадлівай карове ...(бог рог не дае).

5. Было б балота... (а чэрці знойдуцца).

6. Ведае кошка... (чые сала з’ела).

7. Век жыві ...(век вучыся).

8. Выпраўлялі быку рогі...(ды скруцілі шыю).

9. Гром не грымне ...(мужык не перахрысціца).

10. Гультай за работу... (мазоль за руку).

11. Каб ведаў, дзеў падзеш...( то саломкі падслаў бы).

12. З ваўкамі жыць...(па-ваўчынаму выць).

13 Добрае слова на палічцы ляжыць...(а дрэннае па дарожцы бяжыць).

**Нацыянальнае адзенне беларусаў**

**Белару́скі нацыяна́льны касцю́м** —
Комплексы адзення, абутку і аксесуараў, якія склаліся на працягу стагоддзяў для выкарыстання беларусамі ў штодзённым і святочным ужытку. Нацыянальны касцюм мае надзвычай высокую культурную каштоўнасць і з'яўляецца адным з этнічных атрыбутаў беларускага народа.

Вылучаюць прынамсі **3 разнавіднасці беларускага нацыянальнага касцюма** (у адпаведнасці з сацыяльнай прыналежнасцю):

- **сялянскі;**
- **мяшчанскі;**
- **шляхецкі.**

**Беларускі сялянскі** мае глыбокія гістарычныя карані і захаваў шмат архаічных рыс. Спалучаючы ў сабе практычнасць і эстэтычнасць, ён з'яўляўся і з'яўляецца значна большай рэччу, чым проста адзеннем ці нават

мастацкім творам. Сялянскі касцюм беларусаў адлюстроўваў мясцовыя традыцыі, патрэбы і сацыяльны статус прадстаўнікоў беларускага народа, светапогляд майстроў, якія яго выраблялі, а ў дэкаратыўным арнаменце часам чытаюцца цэлыя змястоўныя гісторыі. Звычайна менавіта сялянскі касцюм маюць на ўвазе, калі вядуць гаворку пра нацыянальны касцюм беларусаў увогуле.

**Мяшчанскі і шляхецкі нацыянальныя касцюмы** ўпісваюцца ў агульнаеўрапейскія модныя тэндэнцыі, але пры гэтым маюць у сабе вялікую колькасць нацыянальных асаблівасцей, што дазваляе лічыць іх за разнавіднасці беларускага нацыянальнага касцюма.